Сяргей Дубавец



...мы ня толькі нацыя паэтаў,

але й нацыя мянтоў...

# Мой народ

***web-гутарка на старонцы Litara.net***

***На працягу ліпеня сёлета гэтыя нататкі пісаліся ў выглядзе інтэрнэт-форуму на сайце Litara.net. Штодня аўтар пад рознымі імёнамі рабіў чарговыя запісы, якія перамежваліся рэплікамі іншых наведнікаў, а таксама «клонамі» гэтых наведнікаў. Такім чынам, тэзы і антытэзы «агучваліся» рознымі персанажамі і рознымі рэальнымі людзьмі, у выніку чаго простая, на першы погляд, тэма разглядалася з самых розных бакоў, а культуралагічныя занатоўкі набывалі часам выгляд п'есы. Аўтар шчыра ўдзячны ўсім, хто ўзяў удзел у гэтым пісаньні-дзействе.***

***У гутарцы ўдзельнічаюць: tarton (ён жа аўтар), bielarecki (web-майстар старонкі «Аголеная Беларусь») і ягоныя «клоны» bielarecki1 і bielarecki101, Dubaviec і ягоны «клон» dubaviec1, alice1 («клон» рэдактаркі старонкі Litara.net Алісы Бізяевай), raman (Раман Кардонскі) і raman1, anna (Ганна Кісьліцына) і яе «клон» ann, babkow (Ігар Бабкоў) і babkow1, mikita (Зносак), Mesidz, rydel, adam (Адам Глёбус), Palivac, arkush (Алесь Аркуш), don, а таксама: Глядач, Цікаўны, Свабодавец, Падманутыя, ТТ, жыд, зэка (верагодна, тая самая асоба).***

*Правапіс рэплік удзельнікаў форуму захаваны.*

**marmon:** Янку Купалу ў 30-я гады за словы «мой народ» нехта В. Піліпчук назваў «беларускі führer». Яшчэ «мой народ» ужываў Караткевіч. Пасьля, здаецца, Пазьняк. Нарэшце, Лявон Вольскі («Глядзець, на мяне глядзець Сонным позіркам будзе мой народ»). Даволі пераканаўчы выходзіць шэраг. Усё астатняе — можа быць, а можа й ня быць.

**marmon:** А во яшчэ — Лукашэнка: «Я мой народ за цывілізаваным сьветам не павяду».

**marmon:** Цалкам шэраг выглядае так: Купала – Караткевіч – Пазьняк – Лукашэнка – Вольскі. Рэч у тым, што духу на такія словы хапае толькі адзінкам. Магчыма, нехта дапоўніць мой шэраг?

**marmon:** Стоп. Караткевіч?.. Сказаць «мой народ» – тое самае, што сказаць «я прарок». Караткевіч мог прамаўляць такое толькі ў духу сваіх герояў, але не ад сябе самога. Палічыў бы, што нясьціпла. А ў тым і рэч, што для словаў «я прарок» сьціпласьць – не крытэрый. Гэта сьведамы выбар здольнага на такое чалавека. Як асоба Караткевіч – той, хто кліча прарока або хто прагалошвае ягоны прыход. Але сам — не. Значыць, далей без Караткевіча.

**bielarecki:** Moj narod nia chodzic na maju web-staronku, bo ja napisau jaje lacinkaj.

**marmon:** Э-э, тут ня тое! Тут народ – група блізкіх ці знаёмых людзей, а ня нацыя. («Ну што, народ, разьбягаемся?» – казалі студэнты пасьля пасядзелкі…) Адзін мой сябрук «мой народ» кажа на жонку зь дзецьмі. Адчуйце розьніцу.

**Dubaviec:** Мне згадалася нешта такое: «Народзе мой, народ мой беларускі, зноў над табой падняў нагайку польскі кат»… Але, мабыць, гэта таксама ня тое. Інвэрсія «народ мой» і зьмякчэньне «народзе мой» – гэта нібы зьмякчэньне натуры, нібы боязь прамовіць па найвялікшым рахунку: «Мой народ». Такое прамовіш, і самому страшнавата робіцца.

**marmon:** Звычайнаму чалавеку страшнавата прамаўляць перад стадыёнам народу, а калі яшчэ й нешта імправізаванае, і нешта павучальнае, а каб яшчэ й слухалі, стаіўшы дых… І толькі выбраным адзінкам даецца спакойна і ўпэўнена казаць: «мой народ». Тут нейкае звышэлітарнае прызваньне. Бо прарокі (і фюрэры таксама) гэта робяць, ня думаючы, ці ім страшна, ці не. Гэта ў іхнай прыродзе.

**alice1:** Вольскі падобны да Мікі Рурка, а я не ўяўляю, каб Рурк граў Янку Купалу ці Зянона Пазьняка і казаў: «Мой народ».

**marmon:** Гэта таму, што ў Рурка вочы юрлівыя?.. Але ж вы забылі Лукашэнку. Ці ўяўляецца Рурк у ролі Лукашэнкі? Ці гэта для Нікалсана роля?.. Думаю, ва ўсім вінаватая беднасьць майго сьпісу.

**Dubaviec:** Лукашэнку будзе граць William Bradley Pitt з «Байцоўскага клюбу».

**marmon:** Беларуская нацыянальная рыса – багатае ўяўленьне загуляе сабою бедную рэальнасьць. Аказваецца, во дзе трэба шукаць нашых прарокаў, а таксама «лідэраў нацыі» і «модных пісьменьнікаў» – у галівудзкіх кінах!

**Глядач:** Мармонаў цягне ў мармонію, у галівудзію цягне марнатраўцаў і мармытлівцаў. Прарокі жывуць у Беларусі; беларускія прарокі, прынамсі.

**marmon:** У Беларусі «пчолы як гусі» і «камары шыны пракусваюць». Яшчэ «ў Беларусі Бог жыве». Так бы мовіць, «спасіба парціі за наша шчасьлівае дзецтва»… Пачынаючы гаворку, я хацеў адысьці ад пустаслоўя і менавіта назваць гэтых нашых прарокаў. Менавіта прарокаў, бо гэта найбольш адпаведнае азначэньне асобы, якой сьведама ці нясьведама ва ўсіх жанрах культуры і сфэрах жыцьця чакаюць у Беларусі ўсе. У каго вераць, як у цуд, і на каго спадзяюцца. А вы мне «прарокі жывуць у Беларусі»… Як усё адно марсіяне на Марсе.

**marmon:** «Мой народ» – гэта ключ пошуку такіх асобаў, якія, безумоўна, ёсьць у Беларусі, але да часу незаўважныя (як ППРБ) або, можа, і нечаканыя ў такой ролі (як Вольскі). Натуральна, найпрасьцей шукаць іх сярод людзей, якія так ці інакш выказваюцца. Гэта як індыкатар пэўнага амплуа. Можа быць выдатны і папулярны

пісьменьнік (Быкаў, да прыкладу), які, аднак, ніколі ня скажа «мой народ» у тым, Купалавым значэньні. А вось Хадановіч, можа быць, і скажа (гэта абстрактнае дапушчэньне). І сэнс такога пошуку ў тым, каб разгледзець пасіянарных асобаў, ня тых, што пішуць або выдаюць выдатныя кніжкі, а тых, што – матory культуры і нацыянальнага духу.

**bielarecki:** Kryter prykladajecca nie z taho boku, zdajecca. Napisac u svajim viersu/ apoviedzie «MOJ NAROD» moza luby grafaman. Ale heta nia zrobic jaho Piesniarom ahulnanacyjanalnaha mastabu.

**marmon:** Гэта вам сапраўды здаецца. Дайце прыклад такой графаманіі. Гэта, зрэшты, усё, чаго я прасіў, – прыкладаў.

**marmon:** Або паспрабуйце самі даць адпаведнае выказваньне. Гэта зусім ня проста. Прынамсі, зразумееце, што на вашу старонку ня ходзяць зусім не таму, што вы напісалі яе лацінкай.

**bielarecki:** Na maju staronku chodziac dobra. Navat zanadta dobra. Ale nia moj narod, a amerykancy.

Kali zapracuje knihi.com, mozna budzie zrabic posuk «Мой народ» unutry Bielaruskaj Palicki. A pakul hladzim Google.com. 29 zhadak na sajcie knihi.com.

**marmon:** Вы так усе праблемы вырашаеце? А мне патрэбны вынік. Я перагледзеў усе 11.700 вашых спасылак (шкада, што вы самі гэтага не зрабілі перад тым, як адправіць мяне туды): Біблія, Мілошавіч, Салжаніцын і народы Камчаткі. Прынцыповае пацьверджаньне таго, што напісана мною вышэй. Цытата з Брылёвага героя і… усё. Урэшце, гаворка ідзе не пра статыстыку і мэханічны пошук (нехта сказаў гэтыя словы «у сарцах», нехта «з вока на вока», нехта «всуе», а нехта ў кагосьці «за сьпінай»), а пра асобаў, якія прамаўляюць гэтыя словы публічна з Купалавым значэньнем, маючы на ўвазе нацыю і сваю поўную адказнасьць за яе. Такіх прыкладаў ваша мэханіка не дае. І ня дасьць, хачу вас запэўніць.

**marmon:** Во яшчэ Домаш ужываў гэтыя словы ў адпаведным кантэксьце. Але падобна, што гэта было напускное. Хоць, можа, і памыляюся.

**raman1:** (беларэцкаму) Чалавек кнігу піша пра беларускіх прарокаў і фюрэраў, а ты яму пра гуглі-муглі. Калі б я меў талент і пісаў такую кнігу (хоць я пісаў бы ўсё ж дэтэктывы), я б здорава ўзлаваўся на такія парады.

**bielarecki:** Spakojna, Kardonski.

Marmonie, ja Vas klikac pa spasylkach nie prymusaju. Ale zrabic «reality check» vasych teoryj Vam nie zaskodzic. Kali google.com pacvierdzaje vasy teoryji – vielmi za Vas rady. Kali nie – zdajecca, Vas heta nie nadta zasmucaje.

«Вы так усе праблемы вырашаеце? А мне патрэбны вынік.»

U mianie prablemau niama. Asabliva z «narodam». I vyniki mnie nie patrebnyja. Chacieu Vam dapamahcy. Atrymau nazad niesta nakstalt virtualnaha plauka. Vielmi cikava.

**marmon:** Пляўкі ня ў гэтым форуме. Тут ідзе сур’ёзная работа на вынік. Калі ж вынік без патрэбы, якая можа быць дапамога. Дзякую за ўдзел.

**ann:** Шчыра дзіўлюся, што аўтар эратычнага сайту выяўляе такую халоднасць да тэмы прарокаў і фюрэраў. Мне здаецца, што ўсклікнуць «Мой народ!» — так сексуальна.

**bielarecki1:** Hanna, pry czym tut seskualna. Heta biznis, nie bolsh.

**ann:** *(Беларэцкаму)* Я ж гэтаму і дзіўлюся. Калі на прарокаў з фюрэрамі глядзец так як на бізнес, то ніякага пачуцца не ўзнікне.

**mikita:** меджду протчым…

**raman1:** На маю недасьведчаную думку, на ўсё трэба глядзець, як на бізнэс: і на сэкс і на фюрэраў і на дэтэктывы. Бо толькі так да ўсяго гэтага пацягнуцца людзі, шырокія масы і нам удасца ўратаваць беларускую мову ад зьнікненьня.

**marmon:** Э-эх, сабраўся я ў засені Літары накідаць эскіз тэкста, пра рэчы складаныя і простыя, а тут нават Кардонскі, які заклікаў Беларэцкага не замінаць, лезе

са сваімі дэтэктывамі. Жарсьці на пустым месцы. Нават сэкундантам быць ня хочацца.

**Dubaviec:** Чым бываюць нядобрыя форумы – зносіць з тэмы. Ці сапраўды з усяго сьпісу прадстаўленых на litara.net літаратараў «Мой народ» прамовіў адзін Л. Вольскі?

**Mesidz:** Нават, калі не гаворыш услых «мой народ», але пішаш публічна – для сяброў ці масавага чытача, ты ўсё адно ўзурпуеш права прамаўляць за некага, фармаваць для некага рацыю. Ты аб'ектыўна прапампоўваеш некаму глузды. Без такой узурпацыі, мусіць, проста немагчыма насьмеліцца пісаць публічна, нават, калі ты гаворыш «я», а ня «мы».

**marmon:** Усё слушна, чаму і паўстала гэтая праблема. Паспаліты чалавек угледжвае тут узурпацыю (неадэкватнае сабе месца на алімпе; сорам), а прарок, ці там чалавек пасіянарны, гаворыць гэта адкрытай душой у згодзе са сваёй унутранай прыродай і, натуральна, ніякае ўзурпацыі, ніякага сораму не вычувае. Толькі мне ня хочацца гаварыць пра гэтую зьяву ўвогуле, абстрактна. Таму я й прасіў дапамагчы прыкладамі, безь якіх усё гэта — толькі словы.

**marmon:** «Мой народ» – ня толькі індыкатар пошуку пасіянарыяў, але й індыкатар аналізу асобаў, які дазваляе дасьледніку адчуць маштаб, пульс, «ступень нацыяналізму» творцы. Пытаньне ставіцца так: чаму тая або іншая асоба ня можа сказаць «мой народ» з Купалавым зьместам? Камусьці замінае сьціпласьць (але пра гэта я казаў вышэй), камусьці — замкнёны індывідуалізм, камусьці — біяграфія. Скажам, варта запытацца, чаму «мой народ» ня скажа С. Алексіевіч, і адразу нібыта бачыш пісьменьніцу наскрозь. Небеларускае паходжаньне (для прарока, натуральна, гэта няважна, але для Алексіевіч, хутчэй за ўсё, істотна), расейская мова (хоць гучыць і пішацца фраза і па-беларуску і па-расейску аднолькава), усьведамленьне сябе «чалавекам сьвету». Ну і прыватны характар творчасьці — як формула свабоды. Гэты філязофскі пасыл таксама не ўласьцівы прароку. У выніку маем караценькую характарыстыку С. Алексіевіч, зь якой, думаю, ня стала б спрачацца і яна сама.

**Dubaviec:** Мне ўявілася, што «мой народ» мог бы сказаць Алесь Асташонак. А яшчэ ёсьць пашыранае меркаваньне, што Анатоль Сыс таксама мог бы.

**marmon:** Мог бы, але не сказаў. Купала дэгустатарам на бровары працаваў і праз усё жыцьцё чарку не адхіляў, але ж ня сьпіўся! П'янства ў гэтай справе – такая самая перашкода, як і ўсе астатнія (сьціпласьць, малы маштаб, індывідуалізм і г.д.). Таму «мог бы» ня лічыцца. Затое чаму ня мог – гэта пытаньне. І ўжо на яго п'янствам не адкажаш. Я хацеў сказаць, п'янства – не прычына таго, чаму ён ня мог. Можа быць, якраз вынік.

**Dubaviec:** Даю 100 працэнтаў, што графаман Мятліцкі ў сваіх сьціхаізьвяржэньнях дзе-небудзь ды ўляпёшыў «мой народ», акурат у Купалавым значэньні.

**marmon:** Магчыма. Таму ж мы і гаворым пра прарокаў і фюрэраў, розьніца між якімі бывае амаль няўлоўная (вазьміце куміра Маякоўскага). Таму і Лукашэнка ў мой сьпіс патрапіў. Можа быць, Мятліцкаму больш за ўсё на сьвеце хацелася пісаць «мой народ» і каб супрацоўнікі «Полымя» зьвярталіся да яго «мой фюрэр». Можа быць, які Лукашэнка палітык, такі Мятліцкі паэт. Абодва на сваіх дзялках графаманы. А вось жа ўзьнесла...

**Цікаўны:** Даўно такой грамафоніі не чытаў. Не ведаю як наконт смерці аўтара, а рэдактар дакладна памёр, адразу пасля мастацкага рэдактара.

**bielarecki1:** *(Cikaunamu)* Ty majes na uvazie Oldyngtona?

**bielarecki101:** Nikoha nia maju. Jany usie mianie majuc. I pytanni hlupyja zadajuc.

**marmon:** Агонь майго форуму прываблівае камароў і сьляпнёў, бо мятлікі і пчолы засталіся ў кнігах вялікіх паэтаў. Летучы на вогнішча, мятлік спальвае свае прыгожыя крылы і гіне. Камар жа кіруецца не на зыркі агонь, а на цеплыню чалавечае крыві.

**Mesidz:** Вы шукаеце прарока ці фразу «мой народ»? Можа, гэта задужа фармальны падыход – шукаць прарока па паролю, прычым паролю, выбранаму паспалітым чалавекам? Мы не размаўлялі б тут па-беларуску, калі б нехта ўвесь час не прамаўляў гэтае «мой народ», але іншымі с в а і м і словамі, на якія Вы не зважаеце ў Вашым пошуку. Верш «Быў. Ёсьць. Буду» Караткевіча – прарочы, наколькі гэтае слова агулам можа дастасаваць сьвецкага твору.

**marmon:** Зьнешне гэта фармальны падыход, але я не надзіраў бы тут дранікаў, калі б не адчуў заканамернасьць. Можа быць мноства прарочых словаў, але я выбраў зь іх менавіта гэтыя і, бачу, не памыліўся. Караткевіч таксама патрапіў быў у мой сьпіс, але я мусіў яго выдаліць (чаму – сказана недзе вышэй). І мяне цяпер займае іншае – чаму ён НЕ сказаў гэтыя словы ў Купалавым значэньні. Бо меў вобраз баламута (які ўвесь час падтрымліваў)?..

**Mesidz:** Так, народ – абстракцыя, покуль нехта ня скажа «мой народ» і не аддзеліць сваіх ад чужых. Але, каб баламут Францішак Асызскі не выдурваўся з кветачкамі і птушкамі, можа, у Эўропе цяпер за прарока быў бы Магамед ці Арый, ці, пасьлей, Мармон.

Бажаволкам беларусы ўдзячны мо больш, чымсі прарокам. Хіба не бажавольства фраза «Беларусь – гэта я?», але, мяркую, многія сьвядомыя беларусы праз яе прайшлі.

**ryde:** У сьвеце ё ШМАТ геніяльных пісьменьнікаў, якія ніколі ў жыцьці не напісалі радку «мой народ». І нават пра гэта ня думалі.

Ну адшукаеце вы і вызначыцеся, хто самы круты Пясьняр, які мае права казаць (і кажа) «мой народ». Ну і шо???

Ня бачу сэнсу ў вашых пошуках, хаця пачытаць вашыя допісы было сапраўды цікава.

**babkow:** Самае цікавае чытаць, як Дубавец з Дубаўцом размаўляе. Бо, паводле некаторых стыльнаваротаў, marmon – гэта таксама Дубавец.

**Mesidz:** Гэтыя хлопцы, здаецца, здыхаюць там на Алімпе ад кіслароднага галадаьня ды фарысэйства. Усё, што тут чутна, – прыгожа і стыльна, як галюцынацыя Хэма ў «Сьнягах Кіліманджара». Агонія багоў?

**Свабодавец:** Мэсідж, супакойся… Якія багі, якое галаданне… Звычайнае прышыванне палітыкі да паэзіі, дробнае палітыканства за дробныя грошы.

**marmon:** Прыемна бачыць вашую зацікаўленасьць. Дзякуй. Але цяпер — самае галоўнае, дзеля чаго і ствараўся гэты форум.

**ann:** Ну і што, што Дубавец з Дубаўцом размаўляе. Можа ім удвох найцікавей.

**Dubaviec:** ціха сам з сабою… я вяду бяседу.

**marmon:** *(Mesidz, Rydel)* Дзякуй за цалкам слушныя заўвагі. Цяпер, думаю, сэнс, зьмест і пульс гэтае фразы ў яе Купалавым гучаньні больш-менш аднолькава разумеем і адчуваем мы ўсе. Якраз гэтага я і дамагаўся, каб прапанаваць вам зрабіць наступны крок. Мы больш ня будзем шукаць пракокаў альбо адказваць на пытаньне, чаму тая або іншая асоба не прамовіла гэтых словаў. Тым больш ня будзем распрацоўваць самыя паняткі «прарок», «народ» і г.д. Цяпер усё гатова для самага галоўнага, сур'ёзнага кроку.

**bielarecki:** Herr Grossmeister, usie z nieciarpienniem cakajuc na vash nastupny chod/krok.

**ann:** Яго, відаць, шэф выклікаў са справаздачай за паўгода.

**raman:** *(Мармону)* Каліваспане ня зробіць наступны крок, то яго тады зраблю я, па звычайнай мянтоўскай звычцы: ці дошкай па галаве, ці галавой па дашке. Галава, як лёгка здагадацца, маецца на ўвазе не мая.

**ann:** *(Раману)* І як вы толькі дэтэктывы да канца вытрымліваеце? Ці адразу чытаеце апошнюю старонку?

**marmon:** Зараз. Неўзабаве. Пастарайцеся не раздражняцца, гэта нам не спатрэбіцца. Прабачце за затрымку.

**alice1:** Можа ён перагрэўся? Такая сьпёка! І «Сьнягі Кіліманджара» не дапамагаюць. А я чытала тэорыю, што калі думаеш, дык галава награваецца. Вось сяджу і быццам нават ня думаю, а мазгі расплаўленыя-расплаўленыя.

**babkow1:** А вы паспрабуйце не думаць, а медытыраваць. Тады галава халодная-халодная.

**raman1:** … а сэрца гарачае-гарачае, а рукі чыстыя-чыстыя. Гэта як у мяне што лі?

**raman:** *(Анн)* Я, звычайна, дэтэктывы чытаю да сярэдзіны, а потым пачынаю ствараць схемы зьдзяйсьненьня злачынства, – гэта калі забойца, вор, г.д. яшчэ невядомыя, – і толькі потым дачытываю да канца, правяраючы, наколькі мае версыі спраўдзіліся. Звычайная гімнастыка для мазгоў. Калі рабіць яе рэгулярна, не даваць застойвацца то й перагрэву ня будзе.

*(Усім)* Хачу сказаць, што за ўсе посьцінгі падпісаныя накш як «раман» я ніякай адказнасьці не нясу. Як Беларэцкі слушна заўважыў? «раман1» — гэта клон. Хто яго стварыў і навошта я ня ведаю. Я сачыў за дыскусіяй і ў размову ня лез. І толькі палез? калі «мармон» зацягнуў паўзу.

**anna:** Раман, спакайней трохі! Вось мне мае клоны падабаюцца, шкада толькі – лепяць памылак нават больш, чым я.

**raman:** Ганна, даражэнькая, а хіба-ж я нэрваваўся, ці зь сябе выходзіў? Здаецца, што не… На гэтым форуме я шмат новага для сябе даведаўся. Адно толькі ніколі ня любіў раманы з працягам на некалькі нумароў. Прачытаеш, а тады чакаеш, калі наступны нумар прыйдзе. Не падабаецца мне гэта. А што тычыцца клонаў, то я не люблю, калі хтосьці робіць нейкія заявы ад майго імя, нават калі гэта ўрад.

**rydel:** Зьнік. Хіба пайшоў на пляц Незалежнасьці вершы чытаць прылюдна.

**anna:** Пра клонаў. Кожны прыстойны чалавек павінен пабудаваць дом, пасадзіць дрэва, стварыць клона… Гэта ж адзнака Вашай папулярнасці…

**marmon:** Такім чынам.

**marmon:** Калі вы ўважліва прачыталі ўсё, што напісана вышэй, дык маеце шанец перажыць шчасьлівы момант самапазнаньня ці нават самаадкрыцьця, у выніку чаго можа зьмяніцца ваш погляд на сябе і на ваша культурнае атачэньне.

**marmon:** засяродзьцеся...

**marmon:** Я прапаную вам тэст, які ўмоўна можна назваць «тэстам на Янку Купалу». Але адразу майце, калі ласка, на ўвазе, што вы ня мусіце пытацца ў сябе: «ці я прарок?» і «ці ёсьць ува мне штосьці ад прарока?» Не рабеце самаацэнкі або самааналізу. Гэты тэст ляжыць выключна ў плоскасьці адчуваньняў.

**marmon:** Засяродзьцеся так, як вы рабілі б гэта дзеля мэдытацыі, калі здаецца, што бачыш усё сваё жыцьцё, нібы адзін вобраз. Вашыя думкі пра сябе, пра Беларусь, пра ўсе гэтыя падзеі і ўсіх гэтых людзей, якія побач з вамі, або якія на трыбунах ці ў газэтах і кнігах, на праспэкце або ў вёсцы – усё гэта зьбіраецца ў адзін вобраз.

**marmon:** адзін вобраз вашай жывой краіны

**marmon:** А цяпер спакойна і адкрыта, без усялякіх задніх думак ці падазрэньняў, так шчыра, як вы гэта толькі можаце, з поўнай сьвядомасьцю і адказнасьцю прамоўце гэтыя словы. «Мой народ».

**bielarecki:** lepiej vypalic kanabis.

**Падманутьі:** *(Мармону)* Мог бы крыху й фантазіі праявіць :(((

**ann:** А міне завяло.

**raman:** Я, як і кожны іншы жыхар ЗША, мазгі якога прамыты мясцовым тэлебачаньнем, сумленна выканаў Вашыя, Мармон, рэкамендацыі. І вочы заплюшчыў, і сканцэнтраваўся – мне гэта не цяжка, бо праца такая, – словы вымавіў. Але акрамя жаданьня выпіць піва нічога не адчуў… Дык што, на такі эфэкт і было разьлічана?

**raman1:** Ці гэта ў кожнага будзе сваё? Каму піва, каму яшчэ што? Каму што дадзена?

**ann:** А я, Кардонскі, на Вас больш за ўсё разлічвала. Вы такі мужчына ўвесь. Як

Янка Купала. Вас гэта не магло не патрасці. А Вы пра піва… Добра што пра воблу яшчэ не ўспомнілі.

**babkow1:** Я ад гэтага не змедытыраваў.

**bielarecki1:** A u mianie vyjspla, prauda, z treciaha razu. Mnie heta nia treba, ale ja padumau, shto pabudu sam nia svoj. I pabydu sam nia svoj. I adrazu — tvaram u sniahi Kilimahdzara! Josc u hetym smak, shto ni kazycie.

**raman1:** А я і не кажу. У мяне работа такая. Я таксама, можна сказаць, гэта. Вось зараз вочы заплюшчу і калі ласка — дэтэктыў перад вачыма. Я ўцякаю і я сам жа лаўлю. Сам лаўлю сябе. Свой скрадзены лёс.

**rydel:** Блін, а чаму гэта ў мяне няма клёнаў? Я – не цікавы? Ці замала тут бываю? Ці баіцеся? Не пужайцеся. Всо. Хачу сабе клёна!

**TT:** ТУЕБНІтуебніТУЕБНІтуебніТУЕБНІ……..:-)))))

**alice1:** Па-мойму, marmon свой тэкст дапісаў. Выйшаў у тыраж.

**raman:** *(Анн)* А навошта было на мяне разьлічваць? На сябе лепш разьлічвайце? Тады ня будзе сьлёзак аб «скрадзеным лёсе».

*(Рыдлю)* Ну што ты, Уладзя, як дзіцятка, не раўнуючы. Вунь у яго ёсьць лялька, і я такую-ж хачу! Праўду кажуць жанчыны, што нас мужчын не паймеш: аднаму клоны не падабаюцца, а другі пакутуе ад іх адсутнасьці.

**alice1:** Раман, Вы душка!

**anna:** Раман, у гэтым ёсць нешта мазахісцкае – з чужымі клонамі размаўляць.

**ann:** Я гляджу, Кардонскі ў нас у фаворы. Што і казаць, мужчына!

**ann:** Ладна, пара заканчываць гэта.

**raman:** *(Ганьне)* А як-жа… Я яшчэ цвікі ў рукі й ногі заганяю, каб стыгматы не зарасталі…

**ann:** *(Раману)* Дык.

**raman1:** І люблю вас усіх, хоць ня ведаю, за што. Можа за тое, што гэтак мала вас? І ўсё гэта – ад шкадаваньня? І ці не ад шкадаваньня выгукаюць іншы раз – мой народ? Нават з заплюшчанымі вачыма…

**raman:** Крыху па тэме. Вось калі любога мужыка ў пятніцу папрасіць заплюшчыць вочы, засяродзіцца, аж на мяжы з мэдытацыяй, і пра сябе вымавіць: «Мой народ», а тады запытацца аб чым ён думаў у гэны момант, то адказ на 99% супадзе з маім. І чаго на мяне бочкі пакацілі не разумею.

**Цікаўны:** Ка-ашма-ар!

**raman:** Блін! Так выглядае, што мой клён лепш за мяне піша. Гэць адсюль, гіцаль, не саром бацьку!

**rydel:** Вось калі любога мужыка ў пятніцу папрасіць заплюшчыць вочы, засяродзіцца, аж на мяжы з мэдытацыяй, і пра сябе вымавіць: «Мой народ». Ведаю дакладна, што Mann Kurt будзе думаць пра педзікаў! :)))

**raman:** Магчыма, што й маеш рацыю. Аб чым будзе думаць Mann Kurt для мяне, калі шчыра, загадка. Зусім магчыма, што й пра іх… Ты, Уладзя, паглядзі які ў мяне клён бісэксуалісты вышукаўся. Усіх любіць. Уяўляеш, усіх: і мужчын, і жанчын. Нават тут бацьку абагнаў. Я дык толькі жанчын, дый то збольшага бляндынак.

**Цікаўны:** Ну, Раман, гэта ж не па-хрысьціянску. То ты любіш, то ня любіш. Кажы – кахаю, не кахаю. Любоў не чапай. Нават я, гаўнюк, і цябе люблю, і шчаку другую падстаўлю. А кахаць… Кахай сабе сваіх бляндынак. Мне вось з шатэнкамі інцярасьней.

**Mesidz:** Рамане, бляндынкі Сеціва – спрэс фарбаваныя і хто іх спраўджваў на сэкс-кантроль?

**raman:** *(Цікаўнаму)* Я ніколі ня біў сябе бруднай пяткай у грудзі наконт сваёй хрысьціянскасьці. На Дранікох калісьці пісаў, што калі мяне па шчацэ хлестануць, то адказ будзе нададэкватны – да страты зубоў апанэнтам. Што ніколі не зраблю, і чым у душы ганаруся, што ніколі не падняў і не падніму руку на жанчыну, дзіцё ці

старога чалавека. Ну а што тычыцца каханьня… Дык я мяркую, што кахаць можна адну жанчыну. Ня можа існаваць аднначасова два каханьні. Дарэчы для мяне. Для мяне каханая жанчына, вось ужо васемнаццаць гадоў, – мая жоначка. Іншых жанчын можна любіць як, скажам, творы мастацтва – любуешся, але рукамі не чапляеш. Да мужчын я стаўлюся па-рознаму. Да сяброў з павагай і цяплынёй. Да ворагаў зь нянавісьцю. Да рэшты, – «і не друг, і не враг, а так», – абыякава. У гэтым сэньсе займаюся дыскусіяй на форумах, каб навучыцца культуры вядзеньня дыскусіі. Ведаю што бракуе, але вучуся.

*(Мэсіджу)* Вы, шаноўны, ўжо на адным чымсьці спыніціся. Бо Вам то доказы маёй «мужчынскасьці», то сэкс-кантроль жанчын падавай. Я вось люблю адну тут, на Літары, бляндынку, якая разбурыла мой стэрэатып, што жанчыны бываюць: разумныя, ня вельмі разумныя, дуры і бляндынкі. Вельмі прыемна было даведацца, што ёсьць бляндынкі, акрамя маёй любай жоначкі, разумовыя здольнасьці якіх нашмат перавышаюць мае.

**adam:** *(Раману Кардонскаму)* Дружа, Раман, твой інтэлект роўны разумовым здольнасцям Арлова, а твой розум не саступае здольнасцям Сагановіча. З Навумчыкам і Юрэвічам я даўно не гаварыў, але, мяркуючы па іх тэкстах, саступаюць яны табе. Таму не запаўняй допісы тэатралізаванымі прыніжэннямі ўласных талентаў. Паўторы прыёмаў крыху назаляюць, зацямняюць думку.

**raman:** *(Адаму)* Калі ты ня клён, а запраўды Глёбус, то такая ацэнка майго інтэлекту, вядома, прыемная для мяне. Проста кожнаму зь пералічаных я саступаю ў веданьні гісторыі, беларускай мовы. Перакананы, што нашмат больш ведаю ў галіне кампутараў. Але рашуча ня згодны з такой высокай ацэнкай маіх «літаратурных» талентаў. Ды мне мову яшчэ вучыць трэба. Тое, што часамі выскаківае з-пад клавы й кантролю й трапляе ў, напрыклад, НН, гэта ўжо калі мяне расьпірае, калі не магу маўчаць. Але ведаю, што графаман, бяру сябе за каўнер і стаўлю ў кут. Для мяне літаратурны талент у першую чаргу гэта здольнасьць прыдумаць сюжэт, аблекчы яго ў моўную форму, выкарастаўшы пры гэтым мінімум слоў. А я пакуль гэтага не магу. Калі зь сюжэтам, яшчэ так-сяк, то калі яго пачынаю ўвасабляць у словы, то расплываюся, як тая багна, не раўнуючы. Так што дзякуй, але кожнаму зь пералічаных, табе, Аркушу, Бабкову, Ганьне Кісьліцынай я й запраўды «и в пупок не дышал». Вось калі-б можна было на нейкія літаратурныя курсы запісацца, каб падвучыцца, мову падцягнуць. Але адсутнасьць такіх курсаў намагаюся кампенсаваць тым, што чытаю шмат. Вось і зараз у Бостане шостая гадзіна раніцы, а я ўжо некалькі бачынаў Акулавай «Гараваткі» набраў і пайду зараз перакладаць Гарысана. Бо днём мяне чакае рамонт хаты…

**raman:** *(Адаму)* Размаўляючы з Акулам, пачуў ад яго, што творчасьць нараджаецца ад болю. Ня ведаю, можа ён і мае рацыю. Ну няма ў мяне болю. Пераможца я па характару. Настойлівы, упарты як воўк, калі той за сваёй ахвярай бяжыць. Гэтак і я сваёй мэты дасягаю. А каму такія характары патрэбны ў сучаснай беларускай літаратуры? Там усё больш сьлёзы аб «скрадзеным лёсе». Дый пра гаротную долю беларуса не склаў-бы я песьню. Ну не вымаўляецца ў мяне, такая песьня. Рвецца з грудзі пераможная песьня, якая, – цудоўна гэта ведаю, – вельмі недарэчная ў сучасных умовах. Ды ты-ж і сам мяне не зразумееш, хаця менавіта ты й мог-бы зразумець…

**adam:** Разумею я цябе, Раман, як Hardcore Hardcor(a).

**raman:** Дзякуй табе, Адам. Хоць адзін беларус мяне зразумеў. Для мяне гэта прыемная неспадзяванка. Дзякуй.

**alice1:** А можа быць тут замяшаная жанчына? Бо Лявон Вольскі мог сьпяваць «Гля-дзець, на мяне глядзець Сонным позіркам будзе мой народ» з алюзіяй на словы Ларысы Геніюш «Не глядзі на мяне сумным позіркам», прасьпяваныя Алесем Камоцкім? І тады «мой народ» – гэта мелася на ўвазе Кася Камоцкая, якая тады была ўжо не з Камоцкім, а з Вольскім?

**ann:** Калі гэта праўда, тагды і Вольскага з пачатнага спіса трэба выключаць.

**raman:** Цікава, але-ж самі намагаліся ўсіх прымусіць каб мэдытаваць, словы вымаўляць. Ну й што, калі ў Лявона Вольскага пры словах «мой народ», Кася Камоцкая перад вачыма ўстае? Дык што, тады адразу са сьпісу далоў? Я ня згодны…

**alice1:** Гэта ўжо неяк па-француску выходзіць, бо французы асацыююць сваю краіну і нацыю з пэўнай кабетай – з Катрын Дзянёў і яшчэ з кімсьці. Але такое асацыяваньне павінен прызнаваць увесь народ.

**Dubaviec:** Радзіма і нацыя ў вобразе жанчыны… А што б тады ўяўляла сабе, пішучы «мой народ», Ларыса Геніюш?

**bielareckil:** Zancyny lubiac pa-inshamu.

**ann:** Вы праўда так думаеце?

**raman:** А чаму не? Чаму не жанчына? Калі параўноўваць, то для кагосьці гэта каханая жанчына, а для мяне – дык мая маці. Яе стомленыя, спрацаваныя рукі вясковай настаўніцы, яе добрыя, усёразумеючыя вочы. Дык можа так было і з Геніюш. Як шкада, што зараз ня спытаеш…

**ann:** А для Вас, Раман, гэта, вядома, жонка-бландзінка.

**ann:** Вось так высокую патэтыку зьвялі на побыт. То пра прарокаў гаварылі, а скончылі жонкамі. Нешта ня верыцца мне, што Купала так думаў. Нават што Лукашэнка так думае, ня верыцца. Вольскі – можа быць.

**alice1:** Прабачце, гэта мелася сказаць ня ann, а я.

**raman:** *(Анн)* У Купалы, вядома, ня спытаеш. Тое, што Лукашэнка можа думаць я наогул пад сумлеў бяру. А вось Вольскі тут ёсьць, дык чаму-б у яго ня спытацца. Вы-ж там бліжэй да яго, дык спытайцеся.

*(Усім)* Мяне заўсёды сьмешыць гэтае жаданьне вылучыць прарокаў. А што калі іх ня было? Цікава, а ці ўважаў Купала сам сябе за прарока? Вельмі верагодна, што й не. Гэта ўжо нашчадкі, ідучы сьледам, пачынаюць камусьці мэдалі вешаць, кагосьці з брудам мяшаць… Сама тэма форуму была цікавая, але ўсё зьвялося да тэсту: «Ці я, імя, прарок, ці не?». Дык я й бяз тэсту ведаю, што не…

**Mesidz:** Вычвараемся ў дасьціпнасьці. Закрыйце вочы і пабачце дэманстрацыю. Бажаволкі, пустадомкі і дзеці – вось мой-ваш народ. А нацыя – гэта бюракратыя, карны апарат, падаткаплацельшчыкі. Па мне лепш народ.

**alice1:** У тым жа і справа, што кожны бачыць сваё. І мы пра гэта гаворым, абмяркоўваем, а не вычвараемся. Дапусьцім, гэта літаратурны сэмінар такі. І мы гаворым пра розныя аспэкты, а ня толькі пра нешта адно на ўсіх. Урэшце рэшт — гэта адна з задач Litary.

**marmon:** Пакуль мяне не было, вас вынесла ў цікавую плоскасьць – у пэрсаналізацыю патрыятычнага пачуцьця. І гаворка якраз не аб прароках, а пра чалавека масавага. Усе ведаюць савецкі плякат «Родзіна-маць завёт». Між іншым, беларускія савецкія варыянты гэтага вобразу не спрацавалі. Ёсьць пра што падумаць. Хутчэй за ўсё, гэта несупадзеньне расейскай і беларускай мэнтальнасьці. Відаць, шмат хто зь беларускіх паэтаў на гэтым «пракалоўся». Магчыма, для беларуса радзіма ня маці, прынамсі, ня толькі маці. Магчымыя варыянты (і гэта самае цікавае). Беларус не пачуваецца сынам Беларусі ў такой ступені, як расеец – сынам Расеі. Мы большыя індывідуалісты.

**marmon:** Што вы ўяўляеце сабе, засяроджана прамаўляючы «мой народ»? Раман уяўляе маці. Нехта будзе ўяўляць жонку або жонку зь дзецьмі. Нехта – сястру або брата. Асабіста я хутчэй уяўляю бабулю, але не як маці, а менавіта як бабулю. Некаму можа ўбачыцца краявід.

**marmon:** Калі б сабраць усе нашыя вобразы ў пэўную карціну-мазаіку, мы змаглі б убачыць і адчуць уласна тое, чым мы, беларусы, ёсьць. І ў чым наша розьніца, скажам, ад украінцаў і палякаў, расейцаў або швэдаў. Ясна, што мы не такія. А чым? А якія?

**marmon:** Яшчэ адзін варты ўвагі момант – гэта ўжо пасьля таго, як вы прамовілі ў шчырай засяроджанасьці «мой народ» і ўявілі таго або тое, што ўявілі – паспрабаваць адказаць сабе на такое пытаньне: а ці можа быць так, што нехта, прамаўляючы «мой народ», уявіць сабе – мяне?

**marmon:** Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ўсе прапанаваныя мною тэсты і пытаньні карысныя і сэнсоўныя ня столькі пазытыўнымі адказамі, колькі якраз вытлумачэньнем самому сабе таго, чаму я тыя словы НЕ скажу, чаму я нечага НЕ МАГУ ўявіць і чаму ніхто ніколі НЯ ўявіць мяне.

**raman:** *(Мармону)* Вы так глыбака капнулі, што я й зараз дна разгледзець не магу. А можна сустрэчнае пытаньне? Не? А я ўсяроўна задам. А чаму Вы НЕ скажаце тыя словы. Я вось вельмі нават МАГУ ўявіць, што Вы якраз скажаце.

**marmon:** Скажу, але цяпер ня варта пераходзіць на асобы. Гэта спыняе думку.

**Mesidz:** Добра, я скажу тыя словы. Дубавец – алімпіец, і Мармон – прарок яго:)

Дужа тэхналягічны мы народ, спэцыялізуемся на экспарце прарокаў, а самі патрэбы ў іх не выказваем /ці выказваем?/.

**anna:** Выказваем… Але той, хто будзе Прарокам для мяне, не стане ім для беларусаў… Каб цябе тут выслухалі трэба гаварыць па-расейску і без метафар, піць, і быць гатовым, што падыдзе нехта, паляпае па плячы і скажа: «А вы не так, Прарок, прарочыце, трэба бліжэй да народа прарочыць!»

**raman:** Ну хто там алімпіец, і хто там чый прарок мне цяжка судзіць. Але вось ці маю я, зусім канкрэтны Раман Кардонскі, патрэбу ў прароку? А вы, шаноўнае спадарства? Наконт вас ня ведаю, а наконт мяне… Дык я й сам ня ведаю. Часамі здаецца, што так, але большую частку часу дык і не. Ну вось прыйдзе Ён, Прарок Беларускі, і? Ну што зьменіцца? Крыху ведаючы гісторыю, неяк не надта й хочацца, каб той Прарок прыходзіў. Бо прыйшоў аднойчы да жыдоў Прарок, ня прынялі яны яго, загінуў ён на крыжы. Пакараў Бог за гэта народ той – амаль два тысячагодзьдзі ганяў ён іх па сьвету, пакуль дазволіў вярнуцца на сваю зямлю. Надта ня хочацца, каб такі лёс напаткаў і беларусаў. А ў тое, што ня будуць яны слухаць, на якой-бы мове Ён да іх не зьвяртаўся, у мяне амаль стоадсоткавае перакананьне…

**Palivac:** Няма прарокаў. Няма народу. Родина-мать ад Масквы праз Смаленшчыну і Браншчыну, не зважаючы на мытні, дурманам ахутвае галовы магілёўцаў і гамяльчан, зьвязваючы іх пупавінай з Расеяй. Родзіна-бутылка пануе над усім тым, што называецца Беларусьсю. А на Гарадзеншчыне matka-ojczyzna зьліваецца ў засос з матерью-отечеством. Сутнасьць Беларусі ў адсутнасьці народу і краіны. Каб належыць гэтай Беларусі, трэба ня ведаць нічога пра яе. Каб быць беларусам, трэба ім ня быць.

**Dubaviec:** Залёты ў патэтыку – ад таго, што і прарок – слова біблейскае. Я ведаю двух рэальна дзейных беларускіх прарокаў: Пазьняка і ППРБ. Першаму «няма месца ў сваёй айчыне», другі ніяк ня знойдзе айчыны на сваім месцы. Між тым, абодва маюць міжсобку нейкую харызматычную спаборную повязь і абодва ў якасьці прарокаў цалкам прызнаныя сваім народам. Мне ня раз даводзілася бачыць беларускі кампутар з Пазьняком-апосталам на маніторы або з фразай «ідзіот самы настаяшчы», якая знаёмым сіпатым голасам абвяшчае пра пачатак ці спыненьне працы. Тыя, хто лічыць сябе інтэлектуаламі, ставяцца да згаданых прарокаў саркастычна, але гэта справы не зьмяняе. Прарок абсьмяяны ці зьненавіджаны ад гэтага нічога ня страчвае. Я ж толькі хацеў зьвярнуць увагу на гэтую пару беларускіх прарокаў – як на неапісаную і неацэненую дагэтуль зьяву сучаснае беларускае культуры.

**marmon:** Дык жа каб не залятаць у патэтыку, я й прапанаваў панятак «пасіянарнага чалавека» — каб весьці зусім канкрэтную гаворку пра цяперашнюю беларускую эліту, маральную большасьць, тых, каго, здаецца, так не стае ў Беларусі. У любой сфэры жыцьця і пра любую актуальную праблему вам скажуць што-небудзь накшталт «няма альтэрнатывы», маючы на ўвазе менавіта яго — пасіянарнага чалавека. А «мой народ» — унівэрсальны апазнавальны знак гэтага чалавека.

**Palivac:** Увесь час блытаюць Прарокаў і мэсіяў. Пазьняк і ППРБ – мэсіі. Адзін няспраўджаны. Другі разьвенчаны жыцьцём. А «пасіянарны чалавек»… Яшчэ ўчора быў у родных мясьцінах і бачыў такіх. Гандлююць гарэлкай і спойваюць «народ»-ПШЛаў. Праўда жыцьця.

**Mesidz:** Дастаткова, каб Ганна сказала «будзеш Прарокам для мяне», і гары тады той народ гарам. Радзіма для беларусаў – жанчына. А габрэі гналі ад сябе кабет, Ісус – нават матку. Пазьняк зьнянацку і «не в строку» ажаніўся пад выбары. Лукашэнка так лёгка яго ня ўдзелаў бы, заставайся Зянон каханкам натоўпу.

**ann:** Паздняк якбы жаніўся, а Лукашэнка якбы развёўся. Хто выйграў — мы ведаем… Можа быць, можа быць.

**arkush:** Для цяперашняй Беларусі ўсе гэтыя развагі – пустое места. Бо жывём зараз у інфармацыйнай цывілізацыі (не да канца нацыянальна сфармаваныя). Ну зьявіўся прарок Пазьняк, а ў целявізары сказалі, што быў ён за Гітлерам у паліцыях. І бачыў я гэтых людзей, якія аб тым лямантавалі. Я ім кажу, дык паглядзіце на год нараджэньня: ці можна ў такім узросьце паліць беларускія вёскі? Ну і што вы думаеце, – не пераканаў. Калі нават сам Хрыстос прыйдзе, у целявізары знойдуць што сказаць.

Пакуль не паўстане новае грамадзтва, з новымі сацыяльнымі катэгорыямі насель-ніцтва, з уласнымі інтарэсамі, бізнэсам і прыватнай маёмасьцю, датуль нічога ня будзе. Бо па вялікаму рахунку, сьвет дзеляць пэўныя групоўкі, якія то ствараюцца, то зьнікаюць, змагаючыся за свае інтарэсы. І тыя групоўкі знаходзяць або ствараюць сабе прарока, каб дасягаць свайго.

**raman:** Магчыма, што Пазьняк для кагосьці, для Дубаўца напрыклад, прарок. Але забыліся неяк пра асноўную рысу прарокаў – ахвярнасьць і адмову матэр'яльных дабротаў. Ці назіраем мы гэта ў абодвух прыкладах Дубаўца?

*(Палівачу)* Не памятаю кім сказана, што калі нават адзін чалавек ня выракся сваёй мовы ды культуры, дык народ, – ці нацыя, каму больш падабаецца, – жывы. А то ты, браце штосьці надта мудрагеліста завярнуў…

*(Аркушу)* Слушна. Мы нацыя эгаістаў, мабыць таму для кожнага з нас «мой народ» гэта ў першую чаргу Я, каханы, са сваёй сямейкай. І калі мне скажуць што не, дык адкажу двумя словамі: ха-ха!

**Palivac:** Міты. Адны міты. Пра прарокаў, якіх у рэчаіснасьці няма. Пра інфармацыйную прастору, у якой жыве толькі частка беларусаў. Пра новае грамадства і новае пакаленьне, якія зусім не такія, як гэта ўяўляецца спадару Аркушу.

Пакуль адраджэнцы жывуць у віртуальнай Беларусі, Беларусь сапраўдная і існая крочыць у свой, адной ёй вядомы бок.

Практычна ніхто ня кажа пра сібірызацыю сельскай Беларусі. А яна ж ідзе. Зэкі распаўзаюцца ракавай пухлінай па вёсках. Магу ўявіць, як дзе-небудзь Эдуард Акулін піша новы верш пра Родны Кут, а ў гэты самы час яго родны кут – Вялікія Нямкі, ператвараюцца ў філіял зоны.

Вось яно новае грамадства, спадар Аркуш.

**Dubaviec:** Бязь мітаў якраз нічога й ня будзе. Нацыя жыве мітамі. Хто ня верыць, той упадае ў апакаліптычны настрой. Што мы і бачым. Быў я нядаўна ў тых Вялікіх Нямках. Няма там ані зоны, ані сыбірызацыі. Прыгожэнная вёска на крыніцах і пасярод яе – два дагледжаныя прыкрынічныя крыжы, беларуская архаіка — гэта як царква. Захутаныя ручнікамі крыжы…

**arkush:** *(Palivacu)* Заўважце, я не сказаў, што тое новае грамадзтва ўжо паўстала. Я сказаў, што без яго паўставаньня нічога ня будзе.

Бачу ўсё я, не Марсе жыву, не ў эміграцыі, і нават не ў сталіцы, а ў звычайным беларускім райцэнтры. Бачу, як беларускі дробны бізнэс паднімаюць асобы каўказкай нацыянальнасьці. Бачу, як зрастаецца ўлада і крымінал. Бачу, як сьпіваецца насельніцтва, як нігілізм апаноўвае моладзь, як людзі робяцца ўсё больш

хцівымі і карысьлівымі. Спытаеце, што рабіць? Адкажу. Гадаваць дзяцей і не цурацца свайго.

**raman:** Ну я за нацыю не скажу, чым яна тым жыве, можа мітамі, можа хлебам з салам. Дый з Аркушам крыху не пагаджуся. Бо тыя, хто свайго адцураліся сюды не заглядаюць, як мне здаецца. Дый выхаваньне дзяцей гэта наш, бацькоўскі, абавязак – хочаш, ня хочаш, але выконываеш, калі ты ня злыдзень нейкі. На маю думку, зараз вельмі важна менавіта стварэньне гэткіх нефармальных беларускіх асяродкаў. Бо нават два чалавекі, якія зьбіраюцца разам і размаўляюць па беларуску, гэта ўжо беларускі асяродак. Але трэба, каб не абмяжоўваліся толькі размовамі, а штосьці невялічкае, бо вялікага ніхто ня вымагае, канкрэтнае рабілі на карысьць сваёй культуры. Як мне здаецца, з такіх невялічкіх асяродкаў і складаецца нацыя, ствараецца грамадзкая супольнасьць. Дык супольна той-жа крымінальнай уладзе лягчэй супрацьстаяць…

**Palivac:** *(Раману)* Рамане, прыгожа пра аднаго чалавека, але зь кім ён будзе размаўляць на сваёй мове? Сам з сабой?

*(Дубаўцу)* Асабіста ў мяне ніякіх апакаліптычных настрояў няма. Пішу пра тое, што ведаю. Вы ў Нямках былі, як турыст, альбо госьць. Для мяне ж ваколіцы Нямкоў ёсьць радзімай. Там я жаніўся, там працуе мой брат – таму мне лепш ведаць. Каля двух дзесяткаў зэкаў там. А пра прыроду спрачацца ня буду, бо лепш за гэты куточак (ад Сьвяцілавічаў да Краснай Гары) ня бачыў.

*(Аркушу)* Што рабіць я не пытаў, бо гэта расейскае пытаньне.

**Dubaviec:** Між іншым, якраз культ краявіду адрозьнівае беларускую літаратуру ад расейскай. Зэкі прыходзяць і сыходзяць, а краявід застаецца. І прыкрынічныя крыжы застаюцца. І прарокі. І нацыянальныя міты… А гэтая форумная тусьня нагадвае часам зэкаў, якія сыходзяць, а часам прарокаў, якія застаюцца. І гэта добра.

**raman:** *(Палівачу)* Працытую сябе: «Бо нават два чалавекі, якія зьбіраюцца разам і размаўляюць па-беларуску — гэта ўжо беларускі асяродак.» І дзе я пісаў пра аднаго? Я якраз лічу, што «тихо сам з собою я веду беседу»(с), гэта прадвесьце шызы, калі ўжо ня шыза.

**raman:** *(Дубаўцу)* Вы хоць падкажыце, калі мне сыходзіць, бо не прарок я…

**ann:** Чамусьці вы пытаецеся «калі», а не пытаецеся «куды». Я бы параіла вам, Кардонскі, у Лапландзію. Таму што гэтым летам вы падобны на Дзеда Мароза. Ха-ха-ха.

**raman:** *(Анн)* Дык падобны зь якога боку? Гэта на што Вы нацяк робіце, няўжо на маё бруха? Ай-яй-яй, як ня сорамна, ці-ж можна папікаць чалавека ягоным «працоўным мазалём»? А наконт куды. Дык мне Карыбы бліжэй, дый лепш, прынамсі.

**Mesidz:** Беларусь – гэта краявід… Я ўдакладніў бы на свой полацкі капыл, Беларусь – гэта лес. Мне ў Менску не хапала лесу. На Полаччыне ён заўжды прысутнічае на даляглядзе, нават у горадзе нейкія лапіны лесу. Прычым, гэта ня толькі мой бзік. Ведаю, сябра вучыцца зараз у Менску, дык ён, каб адвесьці сваю крывіцкую ваўкалацкую душу, знайшоў за Менскам нейкі лясок, збудаваў там буданчык і бавіцца цяпер у ім штовыходныя. А вучыцца ён на мэнэджэра нейкага шоў-бізнэса. Вось я сяджу за кампутарам, але дастаткова мне ўзьняць вочы (вядома, днём) – за вакном – лес. Я – дома:)

**marmon:** Усё слушна – краявід. І дзе б ні даводзілася бываць (хоць у «Мармоніі», хоць у самых паштовачных мэгаполісах ці разлогах) – краявід, у параўнаньні з нашым, сьляпенькі, прыпылены, непразрысты (хіба што паліграфія выцягвае). У Беларусі краявід – тыбэцкі, першародны, прадонны. Нягледзячы на тое, што сама Беларусь – біты шлях гісторыі. Але…

**marmon:** Такое месца і такая роля краявіду магчымыя, пакуль няма чалавека, пакуль краіна не пачынае атаясамлівацца з чалавекам. Як толькі ў краявідзе зьявіцца народ, нацыя, так і наш краявід, верагодна, зблякне. І «альбомная прыгажосьць»

нашае Бацькаўшчыны перасяліцца на адмысловыя паштоўкі, якіх пакуль у нас друкаваць не навучыліся. Бо – зноў жа – няма чалавека.

**marmon:** Маю на ўвазе не чалавека – частку краявіду, а самастойную прыродную адзінку, таго, хто надзелены адмысловай энэргетыкай. Будзь ён пракорам ці мэсіям (як мяне слушна паправілі), ці пасіянарыем, ці вар'ятам на чыйсьці погляд – але ён мусіць зьявіцца, той, хто абазначыць сабою «мой народ».

**marmon:** Алесь Адамовіч сустрэў каля ліфту нейкай установы ў Нью-Ёрку пажылага амэрыканца з Коласавым шнобэлем і кашуляй бяз гальштука, але зашпіленай на апошні гузік і адразу зразумеў, што той – беларус. І не памыліўся. А гэта ўжо не краявід. Гэта пачатак народу (калі адсюль пачынаць).

**marmon:** Альбо вазьміце Кардонскага («нагляднае пасобіе» ўсіх форумаў). Хто ён такі? Мент. Звычайны беларускі мент. А вось жа недарэмна менавіта мент – беларускі пасіянарны чалавек. Бо існуе мноства фактаў нацыянальнай, літаратурнай, краязнаўчай ды іншай гуманітарнай актыўнасьці беларускіх мянтоў. І менавіта ў мянты вясковая нацыя дэлегавала сваіх найлепшых дзяцей і ставілася да іх пасьля з адмысловым пачуцьцём, зусім ня так, як у Расеі, дзе іх «мусорами» называлі, або ў Эўропе. І калі паводле гэтай сукупнасьці прыкладаў глядзець, дык мы ня толькі нацыя паэтаў, але й нацыя мянтоў. (Мне запярэчаць выразныя індывідуалісты, але іхны ж індывідуалізм і будзе ім адказам.)

**marmon:** У Беларусі найлепшыя ў сьвеце краявіды. Але гэта тлумачыцца ня толькі нашай любоўю да радзімы, але й адсутнасьцю альбо нясьпеласьцю, нясталасьцю ў гэтым краявідзе нацыі, таго, што пасіянарны чалавек мог бы пазнаць, прызнаць і назваць «мой народ».

**Mesidz:** Мармон, Вашай здольнасьці ахутваць пустату карункамі фраз пазайздросьціў бы і самы круты NLP-іст.

Можа справа не ў недахопе пасыянарнасьці. У нас шмат яркіх людзей, але іхная энергія скіравана на сябе – на ўтаймаваньне таго, што Вы называеце «пасыянарнасьцю», а дзевяць зь дзесяці пакруцяць пальцам ля скроні. Гэта ж такая аграмадная праца штогадзіны кантраляваць сябе, удаючы «сярэднестатыстычнага» :) Магчыма, наша грамадзтва проста ня мае каналаў для канструктыўнай «каналізацыі» пасыянарнасьці. Бо нават у літаратуры наш чалавек несвабодны — ён адпачатку заангажаваны мовай, багушэвічавым «не пакідайма...».

**don:** «У нас шмат яркіх людзей, але іхная энергія скіравана на сябе – на ўтаймаваньне таго, што Вы называеце «пасыянарнасьцю»...»

Гучыць, як прызнанне. Я такіх людзей ведаю. Але лепш бы не ведаць. І тых, хто ад мовы несвабодны, таксама. Не разумею, чаго яны тады лезуць?

**marmon:** «Карункі фраз» дзеля таго, што на выхадзе мне патрэбны літаратурны тэкст. Што да «пасіянарыяў», чыя энэргія скіраваная на сябе, дык ня думаю, што яны вартыя абмеркаваньня. Гэта ўсё адно, што ў жаночым часопісе надрукаваць рэкамэндацыі – як дасягнуць бясплоднасьці.

**marmon:** На маю думку, пасіянарнасьць нічым не перашыбеш – ні ў сабе, ні ў іншых. У згаданым выпадку Вы кажаце пра маторнасьць. Гэта так. Ёсьць людзі, у якіх маторнасьці на сто чалавек, а выніку (перадусім духоўнага) нуль. Вось яны і кідаюцца то Беларусь адраджаць, то грошы зарабляць, маторнасьць іх расьпірае, урэшце ўсё сыходзіць у тую «каналізацыю» (канструктыўную ці неканструктыўную, найчасьцей – дэструктыўную). Але ўсё гэта – хутчэй для сэмінару па псыхалёгіі, чым для гэтага форуму.

**жыд:** Усе албанцы – на адзін твар, агуркагаловыя, заўтра і беларусы будуць аднолькава безаблічнымі, і ты разам з імі.

**raman:** Вядома прыемна прачытаць пра сябе нешта станоўчае, а то больш прызвычаіўся з-пад гор бруду выкарасківацца... Аркуш на іншым форуме трапна заўважыў, што няма нейкай абстрактнай дымкі пад назовам беларуская літаратура. Усё

канкрэтна: пісьменьнік, крытык, выдавец, чытач. Прабачце Мармон, але ну няма такой зьявы, як пасыянарныя беларускія мянты. У ворганы кожны трапляў зь нейкай сваёй прычыны. Я зусім у ворганы ня зьбіраўся, накіраваў райкам камсамолу. Бо сам, як той бурыданаў асёл, стаяў на раздарожжы, ня ведаючы, што выбраць: ці дарагую мне гісторыю, ці такую-ж літаратуру, ці журналістыку. Што тычыцца іншых, дык ня ведаю. Гэта з кожным трэба асобна разьбірацца. Ды й няма ў мяне ў душы ніякай пасыянарнасьці. Няма чаго ўтаймоўваць. Зайздрошчу тым у каго яна ёсьць. А што я раблю ў беларускім руху? Дык гэта самая звычайная злосьць на іншых беларусаў, што яны нейкія нягеглыя, рыхлыя, нятрывалкія, й спроба даказаць, магчыма больш самому сабе, што ня зьмерла нацыя, што ёсьць беларусы-мужчыны, беларусы-пераможцы, беларусы-… Самі працягніце гэты рад. Дый маторнасьці, згодна Мармону, у мяне нямашака, як упрогся адзінаццаць год таму грошы зарабляць ды беларускую справу рабіць, дык і ня кінуўся нікуды. Неяк на ўсё намагаюся знайсьці час, і на заробак грошай, і на грамадзкую працу, і на палітычную, і кніжкі на «Палічку» рыхтаваць ды іншых намаўляць.

**raman:** Хачу выказаць сваё меркаваньне наконт краявідаў. Ну вось я вырас у невялікім беларускім мястэчку Кемелішкі, што на Астравеччыне. З усіх бакоў лес. Пры тым розны лес, ёсьць сасновы бор, і хвойны густы лес, ёсьць бярозавы лес, ёсьць балота, ёсьць халмы, рэчка. І ўсё такое прыгожае. А чаму я тады больш за ўсё гэта горы ды мора люблю? Што я, не беларус тады? Вунь вазіў Шалкевіча, паказваў яму нашы горы, дык і ён захапляўся…

**raman:** *(Мармону)* Духоўнасьць, кажаце… А што гэта такое? Паспрабуйце гэта растлумачыць мне. Бо ніколі не разумеў гэтага тэрміну.

**жыд:** Адрачыся ад роднай мовы, і зразумееш, што страціў частку душы. Да духоўнасьці — шлях праз страты.

**marmon:** Шаноўныя ўдзельнікі гутаркі «Мой народ». Гэты форум ад пачатку і да канца пісаўся мною як замоўлены артыкул, адно што замест варда я абраў вакенка для камэнтару і такім чынам з дня ў дзень разьвіваў тэму, міжвольнымі і добраахвотнымі ўдзельнікамі чаго вы сталі. Дзякуй вам за падказаныя вамі думкі, якіх я адразу не ўлічыў, а таксама за пэўную стымуляцыю працы. На гэты момант тэма падаецца мне вычарпанай, прынамсі, задуманы артыкул напісаны. Сама ідэя – ствараць тэкст у форуме – выйшла плённай і цалкам сябе апраўдала, ёсьць сэнс зьвяртацца да такога жанру і далей. Застаецца спраўдзіць, як гэта ўсё будзе выглядаць у папяровым выглядзе ў часопісе..